**Прысуджэнне Прэміі Мужнасці горада Радэбойль 2022**

У саксонскім месьце Радэбойль ёсьць гістарычная царква «Царква міру». Сама яе назва абавязвае нас служыць гэтае справе міру. То – ёсьць запавет для нас і нашых нашчадкаў, што сьвет не з'яўляецца чымсьці адвеку ўсталяваным, простым ды ўзаконеным. Ідэя прымірэння зараз – найвышэйшая праява культурнага развіцця цывілізаванага чалавецтва. Каб ажыццявіць гэты запавет, грамадзяне нашага горада заснавалі Прэмію Мужнасці і распачалі аднайменнае некамерцыйнае таварыства «Radebeuler Couragepreis e.v.»

Мэта таварыства – падтрымліваць і прапагандаваць ініцыятывы, праекты, прадпрымальнікаў, асобных людзей і групы людзей, што ў цяжкіх умовах:

• **змагаюцца за справу міру й справядлівасці;**
• **падтрымліваюць дэмакратыю;**
• *і пры гэтым* **паводзяць сябе сацыяльна адказна і экалагічна сьвядома;**

Прэмія Мужнасці места Радэбойль прысуджаецца як заахвочванне і падтрымка як у Еўрапейскім, так і ў мясцовым маштабе.

• у мясцовай катэгорыі фокус дзеяньня павінен палягаць у акрузе Радэбойля, у вобласці места Дрэздэна ці наогул Саксоніі. Узнагарода тады становіцаа афіцыйным прызнаньнем, але без грашовага прыза.
• у Еўрапейскай катэгорыі фокус дзеяньня павінен быць на Цэнтральнай, Усходняй ці Паўднёвай Еўропе. У гэтым выпадку памер прэміі 5000 эўра.

Урачыстасьць узнагароды Прэміяй Мужнасці места Радэбойль адбудзецца  27 жніўня 2022 года, у дзень колішняга падпісаньня міру са Швецыяй у 1645 годзе. Гэтым мірным пагадненьнем некалі скончылася Трыццацігадовая вайна ў Саксоніі. Падпісаньне мірнай дамовы тады стала сігналам міру для Нямеччыны і іншых краін Еўропы.
Жыхары Радэбойля ганарацца гэтай гістарычна важнай падзеяй і працягваюць традыцыю барацьбы за мір.

Прапановы для прысуджэння прэміі ў абедзвюх катэгорыях можна падаць на разгляд да **31.03.2022**. Пераможцаў выбірае Савет, обер-бургамістр места Радэбойль мае пры гэтым права голасу і трымае ўрачыстую прамову.

*Адрас:*

*Radebeuler couragepreis e. v.*

*c/o Pfrin. Annegret Fischer*

*Altkötzschenbroda 40*

*01445 Radebeul*

*Deutschland*

*е-мэйл:*

*kontakt@couragepreis.de*